# Спорт

## ТЫДЗЕНЬ СТУДЭНЦКАГА СПОРТУ

З 17 па 24 кастрычніка ў нашым універсітэце будзе праводзіцца Тыдзень студэнцкага спорту, прысвечаны 40-годдзю вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 65-ай гадавіне з дня нараджэння Ленінскага камсамола.

**17-га кастрычніка** на стадыёне ГДУ ў 14 гадзін адбудзецца ўрачыстае адкрыццё Тыдня студэнцкага спорту.

**18-га кастрычніка** — першынство матэматычнага факультэта па міні-футболу.

**19—21 кастрычніка** — масавыя лёгаатлетычныя кросы ў групах, на курсах і факультэтах ГДУ.

**22-га кастрычніка** — масавыя спаборніцтвы на факультэтах па валейболу і ручному мячу.

**23—24 кастрычніка** — масавыя спаборніцтвы па стралковаму спорту і плаванню сярод студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

У апошні дзень спартыўнага Тыдня будуць падведзены яго вынікі.

**ПРАЎЛЕННЕ СПОРТКЛУБА ГДУ.**

## МАЦНЕЙШЫЯ СЯРОД СТУДЭНТАЎ

У Мінску праведзены розыгрыш асабіста-каманднага першынства ЦС СДСТ «Буравеснік» па вольнай барацьбе. На гэтых спаборніцтвах выдатна выступілі студэнты факультэта фізічнага выхавання ГДУ бронзавы прызёр VIII летняй Спартакіяды народаў СССР Нараір Айвазян і Сяргей Зуевіч (трэнеры А. Хатылёў, Ю. Петухоў). Першы з іх аказаўся мацнейшым сярод атлетаў найлягчэйшай вагай катэгорыі, другі — у катэгорыі да 90 кг.

## УЛАДАЛЬНІКІ КУБКА «ГОМЕЛЬСКАЙ ПРАЎДЫ»

**Пазаўчора завяршыўся розыгрыш кубка абласной газеты «Гомельская праўда» па футболу. У турніры паспяхова выступіла каманда нашага універсітэта. Яна прадэманстравала зладжаную гульню і выйшла пераможцай ва ўсіх сустрэчах. Асабліва ўдала, нашы футбалісты правялі заключныя матчы. У паўфінале з лікам 3:0 яны нанеслі паражэнне студэнтам політэхнічнага інстытута, а фінальны паядынак у спортклуба «Алмаз» са шклозавода імя М. В. Ламаносава выйгралі яшчэ больш пераканаўча — 5:1.**

## ЗАВАЯВАЛІ СЯРЭБРАНЫЯ МЕДАЛІ



У зале Гомельскага гарспарткомплексу завяршыўся чэмпіянат БССР па ручному мячу сярод жаночых каманд. Пасля першага круга, які адбыўся ў Брэсце ў лютым, сярод лідэраў былі калектывы Мінска, Гомельскай і Гродзенскай абласцей. Яны і сталі зараз прэтэндэнтамі ў барацьбе за галоўную ўзнагароду чэмпіянату.

У першыя два дні гамяльчанкі (студэнткі ГДУ) параўнальна лёгка атрымалі перамогі над камандамі Магілёўскай вобласці і зборнай школьнікаў. Але найбольшую цікавасць выклікала іх сустрэча са спартсменкамі сталіцы. На працягу 15 мінут нашы дзяўчаты мелі перавагу ў аднаго палявога іграка (адсутнічала ў мінчанак спартсменка ростам у 180 сантыметраў). Гэтай акалічнасці яны не выкарысталі. Атакі праводзіліся хутка, але дапускалася многа страт мяча пры перадачах, чаго не назіралася ў іх сапернiц.

Гамяльчанкі прайгралі першы тайм з розніцай у чатыры мячы, але другі правялі лепш. Перамога ўсё ж дасталася сталічным спартсменкам. На наступны дзень гаспадыні атрымалі чарговую перамогу — над камандай Брэсцкай вобласці з лікам 26:19.

Якое месца зойме каманда Гомельскай вобласці? На гэтае пытанне павінна была адказаць сустрэча з камандай Гродзеншчыны, якая адбылася ў заключны дзень спаборніцтваў. Нашы дзяўчаты правялі яе вельмі сабрана і ўпэўнена. Актыўная атака і ўмелая абарона прывяла да перамогі з вынікам 22:19.

Чэмпіёнкамі БССР сталі мінчанкі. Сярэбраныя медалі ўручаны студэнткам ГДУ, а бронзавыя — прадстаўніцам Гродзеншчыны.

**НА ЗДЫМКУ:** жаночая каманда ГДУ па ручному мячу разам са сваім трэнерам В. Крукоўскім.

Фота **У. Пігунова.**

## ТУРЫЗМ МІЛЬЁНАЎ

Новым праяўленнем клопатаў партыі і ўрада аб здароўі працоўных стала пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым уздыме масавасці фізічнай культуры і спорту». У ёй, у прыватнасці, падкрэсліваецца, што заняткі фізічнымі практыкаваннямі, спортам і турызмам сталі паўсядзённай патрэбай савецкага чалавека, асабліва моладзі.

У апошнія гады вельмі бурна і шырока развіваецца самадзейны турызм. У паходах па роднаму краю, па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа прымае ўдзел звыш 30 мільёнаў чалавек.

Турызм разглядаецца ў нашай краіне як дзейсны сродак выхаваўчай і культурна-масавай работы. Павялічваюцца рады ўдзельнікаў самадзейнага турызму. Новыя мільёны юнакоў і дзяўчат уключаюцца ў лік удзельнікаў Усесаюзнага паходу камсамольцаў і моладзі «Мая Радзіма — СССР», арганізуюцца раённыя, гарадскія і вузаўскія клубы.

Турысцкі студэнцкі клуб «Планета» нашага універсітэта працуе ўжо два гады. Асноўны від, які культывіруецца ў ім,— гэта водны турызм. Вясной 40 студэнтаў на байдарках зрабілі водныя паходы па рэчках Бесядзь — Сож і Іпуць — Сож.

Вялікую цікавасць выклікалі і спартыўныя паходы па паўднёваму Бугу, па карэльскіх рэчках Воньге і Охце і грузінскай Рыёне, якія адбыліся летам. У гэтых паходах трэцяй катэгорыі складанасці ўдзельнічалі студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта.

Сёлета нашы турысты двойчы ўдзельнічалі ў спаборніцтвах. Вясной яны занялі другое месца сярод мацнейшых каманд Гомеля, а днямі выйшлі пераможцамі абласных спаборніцтваў і заваявалі кубак абласнога савета па турызму.

Наш клуб «Планета» цяпер налічвае 50 актыўных членаў. Есць упэўненасць, што гэта лічба значна ўзрасце.

**А. КАРНІЕНКА,**
**старшыня абласной федэрацыі па турызму СДСТ «Буравеснік», загадчык лабараторыі ТСН.**



**НА ЗДЫМКУ:** праходжанне воднага маршрута па карэльскай рэчцы Вoньга.

Фота аўтара.

## ЗАПРАШАЕ СТУДЭНЦКІ КЛУБ

**У студэнцкім клубе пачалі дзейнічаць калектывы мастацкай самадзейнасці:**

**— ансамбль народнага танца «Калінка»;**

**— студэнцкі тэатр «І Т. П...»;**

**— харавы калектыў;**

**— мастацкага слова;**

**— духавы аркестр;**

**— вакальна - інструментальны ансамбль.**

**Пры клубе таксама працуюць аматарскія аб'яднанні:**

**— клуб аматараў класічнай музыкі;**

**— клуб аматараў тэатра;**

**— клуб аматараў кіно;**

**— клуб выхаднога дня.**

**Жадаючых пазнавальна і творча праводзіць свой вольны час запрашаем у студэнцкі клуб «Маладосць».**

## СПАРТАКІЯДА— НА ФІНІШЫ

Набліжаецца да завяршэння XXVI летняя студэнцкая спартакіяда. Пасля 20 праведзеных відаў на першым месцы спартыўны клуб Беларускага політэхнічнага інстытута. На яго рахунку — 9101,5 ачка. Другое месца ўпэўнена ўтрымлівае наш універсітэт— 8205,3 ачка.

Па групе абласных саветаў СДСТ «Буравеснік» Гомельскі аблсавет займае трэцяе месца. На яго рахунку 10689,6 ачка. Як сведчаць лічбы, пераважная большасць з іх набрана спартсменамі ГДУ.

*Праверылі народныя кантралёры*

## МАРУДНАСЦЬ НЕ ПА ЧАСУ

Члены галаўнай групы і групы народнага кантролю адміністрацыйна - гаспадарчай часткі праверылі работу сталовай № 40 і буфетаў у вучэбных карпусах і інтэрнатах універсітэта. У выніку ўстаноўлена, што пункты грамадскага харчавання ГДУ не былі гатовымі да забеспячэння нармальнага харчавання студэнтаў, якія вярнуліся з сельгасработ. Не працавалі буфеты ў вучэбным корпусе № 1, інтэрнаце № 4. Буфетчыца вучэбнага корпуса № 2 знаходзіцца да 17 кастрычніка ў водпуску. Паўстае пытанне: чаму ж яе не пусцілі на адпачынак летам, калі студэнты былі на канікулах?

У сталовай і буфетах вельмі бедны асартымент страў. Напрыклад, 1 кастрычніка 1983 г. на першае была толькі капуста, на другое — плоў і шніцель. Пасля 14 гадзін зусім не было мясных страў.

Патрабуе істотнага паляпшэння санітарны стан сталовых і буфетаў.

Матэрыялы праверкі накіраваны ў АГЧ універсітэта і трэст сталовых, рэстаранаў і кафэ для прыняцця адпаведных мер.

## ВЫСЕЛЕНЫ З ІНТЭРНАТА

Распараджэннем дэканата эканамічнага факультэта па ўзгадненню са студэнцкім прафкомам за ўжыванне спіртных напіткаў у пакоі і амаральныя паводзіны выселены з інтэрната студэнт гр. 0-53 Уладзімір Калуга.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Рэктарат, партком, Савет кафедр грамадскіх навук, кафедра палітычнай эканоміі выказваюць глыбокае спачуванне выкладчыку гэтай кафедры КАНАШЭВІЧУ Анатолю Ісідаравічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Рэктарат, партком, калектыў факультэта фізвыхавання, кафедра грамадзянскай абароны выказваюць глыбокае спачуванне лабаранту гэтай кафедры ЖУКАВУ Пятру Уладзіміравічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці ЖОНКІ.**

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 56-16-52.
АЗ 60630
Заказ 3593